**КАНФЕРЭНЦЫЯ НОВАЯ БЕЛАРУСЬ**

# Палітычная дэкларацыя дэмакратычных сілаў Беларусі

Мы, прадстаўнікі беларускіх дэмакратычных сілаў, канстатуем, што нашая краіна сутыкнулася з гістарычным выклікам – пагрозай далейшага існавання незалежнай і суверэннай дзяржавы Рэспубліка Беларусь.

У Беларусі адсутнічаюць легітымныя органы ўлады, дзяржава і яе інстытуты захопленыя злачыннай групай – прарасійскім рэжымам Лукашэнкі.

Супраць грамадзянаў Беларусі рэжымам Лукашэнкі шляхам злоўжывання ўладай праводзіцца палітыка сістэматычных масавых рэпрэсій.

Праводзіцца палітыка мэтанакіраванага знішчэння беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці і самасвядомасці (этнацыд).

Нашая краіна паступова паглынаецца Расійскай Федэрацыяй, на карысць якой рэжым Лукашэнкі здае беларускі суверэнітэт.

Мы, дэмакратычныя сілы, бачым іншую будучыню для нашай краіны – **незалежную, дэмакратычную Беларусь, як нацыянальную дзяржаву і будучага сябра Еўрапейскага Саюза.**

Дзеля рэалізацыі гэтай мэты мы прымаем і абавязваемся рэалізаваць стратэгію дэмакратычных сілаў, якая ўключае:
- адхіленне ад улады рэжыму Лукашэнкі;
- спыненне саўдзелу Беларусі ў вайне Расіі супраць Украіны і падтрымку Украіны ў абароне сваёй незалежнасці;
- вывад усіх расійскіх войскаў, у тым ліку наймітаў расійскіх ПВК, ваенных аб’ектаў і ядзернай зброі з тэрыторыі Беларусі;
- выхад Беларусі з усіх саюзаў з агрэсарам: Саюзнай дзяржавы, АДКБ і ЕАЭС;
- вызваленне кожнага і кожнай, хто знаходзіцца ў месцах пазбаўлення волі ў Беларусі па палітычна матываваных прысудах;
- усебаковую падтрымку беларускіх добраахвотніцкіх фармаванняў ва УУкраіне і актывістаў у Беларусі;
- замяшчэнне прадстаўнікоў рэжыму ў міжнародных арганізацыях прадстаўнікамі беларускіх дэмакратычных сілаў;
- перамовы аб асацыяцыі Беларусі з Еўрапейскім Саюзам;
- прыцягненне да адказнасці Лукашэнкі і іншых прадстаўнікоў рэжыму, адказных за злачынствы супраць чалавечнасці, ваенныя злачынствы і злачынствы агрэсіі;
- выкарыстанне санкцыйнага інструменту, як аднаго з інструментаў ціску

на рэжым Лукашэнкі з мэтай абмежавання ягоных магчымасцяў для саўдзелу ў вайне супраць Украіны на баку Расіі;
- распрацоўку шэрагу рэформаў для ўстойлівага развіцця дэмакратычнай Беларусі;
- пераход дзяржаўных служачых на бок народа і падрыхтоўку кадраў Новай Беларусі.

Мы падтрымліваем дзейнасць

- нацыянальнай лідаркі Святланы Ціханоўскай як абранай прадстаўніцы беларускага народа;
- Аб'яднанага Пераходнага Кабінета як выканаўчага органа беларускіх дэмакратычных сілаў;
- Каардынацыйнай Рады, як прадстаўнічага органа дэмакратычных сілаў і грамадзянскай супольнасці;
- дэмакратычных палітычных партыяў, рухаў і грамадскіх арганізацый. А таксама беларускіх добраахвотніцкіх фармаванняў, якія змагаюцца супраць расійскай агрэсіі на тэрыторыі Украіны і маюць стаць ядром беларускага нацыянальнага войска, тых, хто прымае ўдзел у плане "Перамога" і кіберпартызанскім руху.

Мы выступаем за правядзенне ў 2024 годзе дэмакратычных выбараў Каардынацыйнай Рады як прадстаўнічага органа беларускага народа.

Далучыўшыся да дадзенай дэкларацыі, мы ствараем шырокі рух "*Новая Беларусь*" і бярэм на сябе адказнасць за дасягненне агульнай мэты.